**Вучэбная дысцыпліна «Актуальныя аспекты методык выкладання спецыяльных дысцыплін»**

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята (агульная вышэйшая адукацыя) Спецыяльнасць: 6-05 0113 -02 Філалагічная адукацыя. Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская) Цыкл спецыяльных дысцыплін: дзяржаўны кампанент * |
| **Кароткі змест** | Асноўныя паняцці методыкі выкладання. Агульная характарыстыка прадметаў "Беларуская мова", "Беларуская літаратура", "Англійская мова". Знаёмства з канцэпцыяй моўнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і канцэпцыямі вучэбных прадметаў. Асаблівасці сучаснай вышэйшай адукацыі. Спецыфіка выкладання беларускай мовы ва ўмовах двухмоўя. Агульнадыдактычныя прынцыпы навучання. Агульнаметадычныя (прадметна-арыентаваныя) прынцыпы навучання. Метады і прыёмы навучання мове і літаратуры. Класіфікацыя адукацыйных тэхналогій. Адукацыйныя тэхналогіі навучання мове. Навучання літаратуры. Школьная праграма. Падручнік як асноўны сродак навучання. Дыдактычныя матэрыялы. Віды і формы арганізацыі навучання. Арганізацыя вучэбнай дзейнасці школьнікаў. Патрабаванні да сучаснага ўрока. Тыпы і віды ўрокаў па мове, па літаратуры. Нагляднасць і яе роля на ўроках мовы, літаратуры. Вучэбна-метадычнае і інфармацыйнае забеспячэнне спецыяльных дысцыплін. |
| **Фарміруемые кампетэнцыі, вынікі навучання** | Базавыя прафесійныя кампетэнцыі: УК-6. Ажыццяўляць прафесійную дзейнасць ва ўмовах абнаўлення яе мэтаў, зместу, змены тэхналогій, вызначаць метады рашэння прафесійных задач, ацэньваць іх эфектыўнасць і якасць. БПК-1. Праектаваць працэс навучання, адбіраць метады, формы, тэхналогіі, якія адпавядаюць выхаваўчым мэтам і задачам, з улікам накіраванасці ў галіне тэорыі і методыкі педагагічнай дзейнасці. БПК-5. Ажыццяўляць адбор зместу, формаў, метадаў і сродкаў навучання і выхавання, прымяняць іх у адукацыйным працэсе з улікам узроставых і псіхалагічных асаблівасцей навучэнцаў. БПК-16. Выкарыстоўваць методыку выкладання замежнай мовы з апорай на родную мову. Студэнт павінен *ведаць:* тэарэтычныя асновы Канцэпцыі моўнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і канцэпцыі вучэбных прадметаў "Беларускай мова", "Беларускай літаратура", "Англійская мова"; сучасныя стратэгіі навучання мове і літаратуры, падыходы да арганізацыі навучання, яго сучасныя тэхналогіі; сутнасць працэсу навучання мове і літаратуры і ўмовы яго эфектыўнасці; мэты прадметнай адукацыі, прынцыпы адбору і структуравання вучэбнага матэрыялу, сродкі, формы, метады і прыёмы навучання; *умець:* творча падыходзіць да авалодання канцэпцыяй аўтараў сучасных падручнікаў па мове і літаратуры; аналізаваць сродкі навучання мове і літаратуры, абгрунтоўваць выбар форм, метадаў, прыёмаў навучання; ацэньваць ход і вынікі навучальнай дзейнасці (гнастычныя ўменні); аналізаваць уласную дзейнасць з мэтай яе ўдасканалення і павышэння сваёй кваліфікацыі. |
| **Прэрэквізіты** | "Асновы педагогікі і псіхалогіі". |
| **Працаёмкасць** | 4 заліковыя адзінкі,160 акадэмічных гадзін, з іх 86 аўдыторныя: 42 г лекцый і 44 г практычных заняткаў. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 3-й семестр, экзамен. |